## З ПАШЫРАНАГА ПАСЯДЖЭННЯ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА

# Якасць ведаў і навуковых даследаванняў — наш галоўны паказчык

**24 студзеня ў актавай зале ГДУ адбылося пашыранае пасяджэнне Савета універсітэта, у якім прыняў удзел прафесарска-выкладчыцкі састаў нашай ВНУ. Па дакладах прарэктара па навуковай рабоце прафесара М. В. Навучыцеля, прарэктара па вучэбнай рабоце члена-карэспандэнта АН БССР Л. А. Шамяткова, прарэктара па завочнаму і вячэрняму навучанню дацэнта А. І. Балтоўскага было абмеркавана пытанне аб выніках навукова-даследчай, вучэбнай і вучэбна-метадычнай работы ў падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў за 1982 год.**

**У абмеркаванні дакладаў прынялі ўдзел начальнік НДС М. І. Твардоўскі, загадчык кафедры оптыкі дацэнт А. М. Сердзюкоў, дацэнт кафедры рускай літаратуры М. А. Маляўка, загадчык лабараторыі сістэмнага праграмавання дацэнт І. В. Максімей, загадчык кафедры мінералогіі, петраграфіі і геахіміі прафесар В. А. Вахрушаў, загадчыца вучэбнай часткі ГДУ Н. І. Папкова, намеснік дэкана фізічнага факультэта Д. Р. Лін, рэктар ГДУ акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць.**

**Аб рабоце кафедры навуковага камунізму па падрыхтоўцы студэнтаў усіх форм навучання да здачы дзяржаўнага экзамена расказаў на Савеце загадчык кафедры навуковага камунізму дацэнт У. І. Качаткоў.**

**Прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў інфармаваў Савет аб стане вывучэння асноў стандартызацыі ў ВНУ рэспублікі.**

**У рабоце Савета прыняў удзел і выступіў галоўны інспектар упраўлення навукі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Д. М. Саковіч.**

**Ніжэй друкуюцца ў ізлажэнні даклады прарэктараў М. В. Навучыцеля, Л. А. Шамяткова, А. І. Балтоўскага.**

ВАЖНАЕ месца ва ўдасканальванні падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй, у паляпшэнні камуністычнага выхавання студэнтаў, сказаў у пачатку свайго даклада прарэктар па навуковай рабоце М. В. Навучыцель, належыць навуковым даследаванням, якія праводзяцца ў ВНУ, павышэнню ўзроўню падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў, стварэнню навуковых устаноў, сучаснай лабараторнай базы, аснашчэнню яе навейшымі прыборамі, апаратурай, вылічальнымі сродкамі і г. д. Рэктарат, Савет універсітэта ў мінулым годзе ўдзялялі гэтаму вялікую ўвагу. Пытанні павышэння навуковага ўзроўню спецыялістаў, развіцця НДР, стварэння і ўмацавання навуковых устаноў, матэрыяльна-тэхнічнай базы сістэматычна ставіліся і абмяркоўваліся на пасяджэннях парткома, Савета універсітэта.

У 1982 годзе рэктарат, навуковы аддзел, дэканаты і кафедры працягвалі работу па ўзгадненню, удакладненню і зацвярджэнню навуковай тэматыкі на XI пяцігодку, забеспячэнню больш высокага ўзроўню выконваемых работ і іх каардынацыі. Пэўныя вынікі атрыманы. Выконваемыя ва універсітэце даследаванні ахоплівалі ў 1982 годзе 10 асноўных навуковых напрамкаў. Тэматычны план НДР уключаў 82 тэмы, у тым ліку 50 дзяржбюджэтных і 32 гаспдагаворных. План у цэлым выканан.

Аснову плана навукова-даследчых работ універсітэта, як адзначыў дакладчык, складала важнейшая тэматыка. У цэлым яе ўдзельная вага — 78 працэнтаў, што значна вышэй з папярэднім паказчыкам ў 1977 г. (39,6 прац.) і 1981 — 59,8 прац.

Вынікі навуковых даследаванняў і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў ва універсітэце аналізаваліся пры падвядзенні прафкомам вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва. Дакладчык назваў яго пераможцаў. У галіне навукі лепшыя месцы сярод факультэтаў у 1982 годзе занялі: 1-е — эканамічны, 2-е — фізічны, 3-е — геалагічны. Сярод кафедр гуманітарнага профілю першае месца заняла кафедра ТСАЭІ, другое — педагогікі і псіхалогіі, трэцяе — палітэканоміі. Па кафедрах прыродазнаўчага профілю лепшымі названы кафедры тэарэтычнай фізікі, оптыкі, заалогіі і аховы прыроды.

Адным з сур'ёзных недахопаў у арганізацыі і правядзенні гаспдагавораў НДР у ГДУ, які выявіла камісія рэспубліканскага Камітэта народнага кантролю, сказаў далей М. В. Навучыцель, з'яўляецца нізкі працэнт работ па мэтавых праграмах, мала выконваецца і работ для прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі, нізкая іх эфектыўнасць. У 1982 годзе ўдзельную вагу важнейшых тэм па гаспдагаворных работах удалося некалькі падняць — з 22,5 прац. да 53,1 прац. Гэта добры паказчык. Аднак слабым месцам усё яшчэ застаецца ўдзел у выкананні мэтавых комплексных праграм. Паказчык тут усё яшчэ нізкі — усяго 6 праграм (па аб'ёму 32,3 прац).

Па выніках праверкі народнага кантролю універсітэту ўказана і на недапушчальнасць таго, што частка гаспдагаворных работ, якія выконваліся ў 1981 — пачатку 1982 года, не далі эканамічнага эфекту. Сур'ёзным недахопам з'яўляецца і тое, што мае месца заўчаснае закрыццё работ. Гэта значыць, упустую траціліся дзяржаўныя сродкі.

У выніку ўдасканальвання форм і метадаў арганізацыі ўкаранення вузаўскіх распрацовак, сказаў М. В. Навучыцель, у справаздачным годзе 37,5 прац. гаспдагаворных работ знайшлі прымяненне ў год іх завяршэння. Гадавы эканамічны эфект, атрыманы ў справаздачным годзе галінамі народнай гаспадаркі ад выкарыстання завершаных у ГДУ распрацовак, павялічыўся на 12 прац. у параўнанні з 1977 годам і на 51 прац. зменшыўся ў параўнанні з 1981 г. і склаў 1518, 3 тыс. рублёў. Адносны эканамічны эфект на 1 рубель агульных затрат на НДР у 1982 годзе склаў 0,98. Найбольш важкі ўклад у выкананне плана па эканамічнай эфектыўнасці ўнеслі фізічны і матэматычны факультэты. М. В. Навучыцель назваў найбольш эфектыўныя распрацоўкі, якія былі ўкаранёны ў вытворчасць.

Далей дакладчык гаварыў аб навуковых і навукова-метадычных публікацыях супрацоўнікаў ГДУ. У 1982 годзе імі было выдадзена 4 манаграфіі, адзін падручнік, надрукавана 139 навуковых артыкулаў у савецкіх і замежных часопісах, апублікаваны тэзісы 8 міжнародных канферэнцый і 127 — усесаюзных. У выдавецтве ГДУ ратапрынтным спосабам выдадзена вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры агульным аб'ёмам 93,9 друкаваных аркушаў. Акрамя таго выдадзены тэзісы абласной навукова-метадычнай канферэнцыі «Удасканальванне выкладання грамадскіх навук у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС» і тэзісы абласной навукова-практычнай канферэнцыі «Жывёльны свет Беларускага Палесся, ахова і яе рацыянальнае выкарыстанне».

У параўнанні з 1981 годам вынаходніцкая справа ва універсітэце ўсё яшчэ застаецца на нізкім узроўні як па колькасных, так і па якасных паказчыках. Вынаходніцтвы ГДУ мінулых гадоў не ўкараняюцца ў народную гаспадарку, не даюць эканамічнага эфекту, не патэнтуюцца за мяжой. Вялікія недахопы ёсць і ў арганізацыі патэнтна-ліцэнзійнай работы. Таму неабходна, адзначыў М. В. Навучыцель, забяспечыць якаснае паляпшэнне гэтых важных участкаў работы.

У дакладзе гаварылася аб падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў ГДУ за 1982 год. Пры іх падрыхтоўцы, акрамя аспірантуры, эфектыўнасць работы якой у 1982 годзе склала 68,8 прац., выкарыстоўваюцца і іншыя віды павышэння кваліфікацыі: ФПК. і ІПК, навуковыя стажыроўкі.

3500 студэнтаў або 97,3 прац. ад агульнай колькасці студэнтаў дзённай формы навучання прымаюць удзел у НДРС. Як станоўчы фактар, М. В. Навучыцель адзначыў павелічэнне колькасці студэнцкіх публікацый, атрыманне на Усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах студэнцкіх навуковых работ дыпломаў, ганаровых грамат, грашовых прэмій.

УСВАІМ дакладзе на Савеце універсітэта прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў гаварыў аб ролі кафедр у прафарыентацыі моладзі і прыцягненні яе да паступлення ва універсітэт, у арганізацыі прыёму на першы курс, у рабоце па выяўленню патрэб у спецыялістах і г. д. Падкрэслівалася нездавальняючая работа некаторых кафедр універсітэта ў гэтай рабоце. Л. А. Шамяткоў указаў на неабходнасць уключэння пытанняў арганізацыі работы на падрыхтоўчым аддзяленні, вучэбна-кансультацыйным пункце і падрыхтоўчых курсах у планы работы кафедр і факультэтаў. Трэба падумаць таксама і над тым, падкрэсліў дакладчык, каб паставіць у прамую залежнасць існаванне спецыялізацый і кафедр ад конкурсу на даную спецыялізацыю. Можна паспрабаваць увесці пры прыёме на першы курс конкурсы не толькі па спецыяльнасцях, але і па спецыялізацыях.

У падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі, гаварылася ў дакладзе, у прыватнасці, у напісанні курсавых і дыпломных работ вялікую дапамогу аказваюць універсітэту філіялы кафедр, створаныя на прамысловых прадпрыемствах і ў акадэмічных інстытутах. Добра зарэкамендавалі сябе філіялы кафедр фізічнага факультэта, іх вопыт пераймалі іншыя факультэты. Аднак, улічваючы новыя патрабаванні, неабходна падняць на больш высокі ўзровень планаванне работы і вядзенне ўсёй дакументацыі па філіялах кафедр.

Залогам паспяховай работы ўсяго калектыву універсітэта, зазначыў дакладчык, з'яўляецца дысцыпліна працы, безумоўнае выкананне правілаў унутранага распарадку, патрабаванняў да прафесарска-выкладчыцкага саставу, усіх супрацоўнікаў універсітэта. Неабходна таксама карэнным чынам палепшыць саму арганізацыю працы, стварыць аптымальную тэхналогію вучэбнага працэсу.

У нашым універсітэце. дзякуючы намаганням рэктарата, грамадскіх арганізацый, кафедры педагогікі і псіхалогіі (якая на чале з яе загадчыкам, членам-карэспандэнтам АПН СССР І. Ф. Харламавым выступае ў якасці навуковага цэнтра), у апошнія гады пачала складвацца комплексная праграма павышэння якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу. На працягу некалькіх гадоў пад кіраўніцтвам І. Ф. Харламава ва універсітэце праводзіцца эксперымент па павышэнню пазнаваўчай актыўнасці студэнтаў у працэсе навучання. Адметнай асаблівасцю эксперымента з'яўляецца тое, што ён базіруецца на навуковай аснове, на шырокім выкарыстанні метадычнага і тэарэтычнага патэнцыялу псіхолага-педагагічнай навукі. Важна тое, падкрэсліў Л. А. Шамяткоў, што вопыт работы універсітэта, адобраны камісіяй Мінвуза БССР, прывёў да думкі: каб паспяхова вырашыць галоўную задачу — павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў — неабходна актывізаваць усю сістэму выкладання, стварыць аптымальную тэхналогію вучэбна-выхаваўчага працэсу. А для гэтага факультэты і кафедры павінны распрацаваць вучэбна-метадычныя комплексы па спецыялізацыях і асобных дысцыплінах. Пад кіраўніцтвам кафедры педагогікі і псіхалогіі можна выканаць гэту работу на высокім узроўні.

СТАНОЎЧЫЯ моманты ў рабоце са студэнтамі-завочнікамі, сказаў у сваім дакладзе на Савеце прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню дацэнт А. І. Балтоўскі, звязаны, перш за ўсё, з узмацненнем кантактаў кафедр са студэнтамі. Вучэбным аддзелам універсітэта наладжана сістэма кантролю за наведваннем заняткаў студэнтамі-завочнікамі. За апошні час значна знізіўся працэнт умоўных пераводаў студэнтаў, хаця ўсё яшчэ застаецца высокім.

Вышэйшым стаў узровень дыпломных работ студэнтаў завочнага факультэта. Аб гэтым сведчаць водгукі старшынь Дзяржаўных экзаменацыйных камісій.

Разам з тым ёсць яшчэ і нямала негатыўных момантаў, якія перашкаджаюць у рабоце, адзначыў А. І. Балтоўскі. Аслаблены кантроль з боку дэканатаў за ходам заняткаў у вучэбныя дні вячэрнікаў, не заўсёды выконваюцца патрабаванні, палажэнні аб курсавых заліках і экзаменах. Не на належным узроўні на некаторых кафедрах рыхтуюцца лекцыі па асобных курсах, на шэрагу кафедр выкладчыкі неаднолькава загружаюцца вучэбнымі даручэннямі. Гэта перашкаджае складанню раскладу, нармальнаму рытму заняткаў.

Кафедрам неабходна падумаць і аб рацыянальным выкарыстанні часу кансультацый для студэнтаў-завочнікаў.

* * *

Савет універсітэта прыняў па абмеркаванаму пытанню разгорнутую пастанову, накіраваную на ўхіленне меўшых месца недахопаў і далейшае паляпшэнне якасці вучэбнага працэсу.

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**У лютым для студэнтаў прапануецца правесці палітычныя інфармацыі і гутаркі на тэмы:**

### I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

1. **Намечанае — здзейснім!** (аб сацыялістычных абавязацельствах працоўных Беларускай ССР на 1983 год).

Матэрыял публікуюць рэспубліканскія газеты.

2. **Надзейная апора міру і працы** (да 65-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту).

Матэрыял публікуюць усе газеты, гл. таксама часопіс «Агит а т о р», № 2 г.г.

### II. ПЫТАННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

3. **Твая асабістая адказнасць за план** (аб доўгу і абавязку кожнага працаўніка своечасова і якасна выконваць планавыя заданні і сацыялістычныя абавязацельствы па ўсіх паказчыках вытворчасці).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

### III. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

4. **Умей жыць сумленна** (рэкамендуецца арганізаваць у калектывах абмеркаванне праблем, узнятых у артыкуле на гэту тэму, апублікаваным у газеце «Правда» 17 студзеня г. г.).

5. **Мяшчанству — бой!** (аб узмацненні грамадскай нецярпімасці да фактаў эгаізму, абыякавасці, пасіўнасці, цхівасці і іншых праяўленняў мяшчанска-абывацельскай псіхалогіі).

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности», гл. таксама часопіс «Агитатор», № 2 за 1983 год.

### IV. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

6. **Адстаяць мір на зямлі** (аб паслядоўным канструктыўным курсе краін сацыялістычнай садружнасці на ўмацаванне міру, міжнароднай бяспекі, развіццё разрадкі).

Рэкамендуецца выкарыстаць апублікаваныя ў друку матэрыялы Нарады ў Празе Палітычнага кансультатыўнага камітэта дзяржаў — удзельніц Варшаўскага Дагавора.

7. **Глабальныя дамаганні Вашынгтона** (аб умяшанні ЗША ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў).

Матэрыял публікуе газета «Звязда», гл. таксама артыкул на гэту тэму, апублікаваны ў газеце «Красная звезда» 23 студзеня г. г.

8. **Капіталізм без прыкрас: у ціісках крызісу і анархіі** (новыя крызісныя з'явы ў сучаснай капіталістычнай эканоміцы).

# УДАСТОЕНЫ ГАНАРОВЫХ ГРАМАТ

Беларуская рэспубліканская камісія садзейнічання Савецкаму фонду міру ўзнагародзіла Ганаровай граматай наш універсітэт за актыўны ўдзел у дзейнасці Савецкага фонду міру і папаўненне яго добраахвотнымі ўзносамі ў інтарэсах умацавання ўсеагульнага міру, свабоды і бяспекі народаў.

Ганаровай граматай Гомельскай абласной камісіі садзейнічання Савецкаму фонду міру за актыўны ўдзел у дзейнасці Савецкага фонду міру ўзнагароджаны былі намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ універсітэта (цяпер загадчык лабараторыямі кафедры ТСАЭІ) ЧМЫХ Уладзімір Аляксандравіч.

# ЛЕНІНСКАЙ ПАВЕРЦЫ — АКТЫЎНАСЦЬ

З 23 лютага ва ўсіх камсамольскіх групах універсітэта пачынаецца прамежкавая грамадска-палітычная атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда — у жыццё!».

Сёння Ленінскі залік — гэта комплексная форма работы камсамола ў сістэме камуністычнага выхавання моладзі, якая фарміруе марксісцка-ленінскі светапогляд, павышае грамадска-палітычную і працоўную актыўнасць маладога чалавека.

У параўнанні з мінулагодняй, сёлетняя грамадска-палітычная атэстацыя будзе мець свае асаблівасці. У святле патрабаванняў XIX з'езда ВЛКСМ, лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС камсамольскім арганізацыям груп — актыўным «выхаваўчым ячэйкам» — трэба настойліва дабівацца эфектыўнасці асабістых комплексных планаў з мэтай умацавання камсамольскай дысцыпліны, арганізаванасці і павышэння актыўнасці юнакоў і дзяўчат. Камісіям па правядзенню Ленінскага заліку трэба арганізаваць работу такім чынам, каб кожны камсамолец лічыў асабісты комплексны план сапраўднай праграмай самавыхавання, пастаяннага і канкрэтнага ўдзелу ў справах калектыву і грамадства. Перад пачаткам Ленінскага заліку камісіі павінны распрацаваць і мець штогодны план работы ленінскай паверкі, дасканала прааналізаваць становішча спраў ва ўсіх вучэбных групах, а ў ходзе заліку — правесці субяседванні з кожным камсамольцам і канкрэтызаваць асабістыя комплексныя планы «Вучымся камунізму, будуем камунізм!» (Узор плана змешчаны ніжэй).

З мэтай павышэння палітычнай сталасці студэнцкай моладзі камітэт камсамола ўводзіць у праграму грамадска-палітычнай атэстацыі **палітычны залік**. Палітычны залік — гэта адна з форм сумеснай дзейнасці камсамольскай арганізацыі і кафедр грамадскіх навук па камуністычнаму выхаванню моладзі.

Праграму палітзаліку складаюць камісіі па Ленінскаму заліку. У праграму павінны ўвайсці такія пытанні, як міжнароднае жыццё, унутраная і знешняя палітыка КПСС і Савецкай дзяржавы, дзяржаўная будова СССР, палітыка братніх сацыялістычных краін, міжнародныя маладзёжныя арганізацыі і саюзы, палітычная карта свету, задачы ВЛКСМ і камсамольскай арганізацыі факультэта ў святле рашэнняў XIX з'езда камсамола.

**Па выніках субяседвання камісія выстаўляе адну з трох адзнак у анкеце-характарыстыцы: «нездавальняюча», «здавальняюча» і «добра».** Паўторная здача палітычнага заліку вырашаецца ў парадку, устаноўленым камісіяй па Ленінскаму заліку. Вынікі здачы палітзаліку ўлічваюцца ў ходзе атэстацыі. Задача выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук, якія абавязкова ўваходзяць у састаў камісіі, — забяспечыць метадычнае кіраўніцтва ў складанні праграм палітзаліку, правесці кансультацыі ў камсамольскіх групах перад залікам.

Атэстацыйныя камісіі павінны звярнуць сур'ёзную ўвагу на эфектыўнасць выкарыстання сістэмы грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў — састаўной часткі Ленінскага заліку — для ўзмацнення актыўнай сацыяльнай пазіцыі членаў ВЛКСМ і камсамольскай арганізацыі групы. Неабходныя адзнакі аб якасці праходжэння грамадска-палітычнай практыкі камсамольцамі ставяцца ў адпаведным раздзеле анкеты-характарыстыкі. Старанна запаўняюцца і астатнія пункты анкеты - характарыстыкі.

Па выніках атэстацыі камісія складае пратакол аб здачы Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!», які неабходна здаць у камсамольскае бюро факультэта (узор формы пратакола будзе змешчаны ў наступным нумары газеты).

**С. АЎСЕЕНКА, сакратар камітэта ЛКСМБ,**
**С. ГУЛЯЕЎ, член камітэта камсамола ГДУ.**

# «ВУЧЫМСЯ КАМУНІЗМУ, БУДУЕМ КАМУНІЗМ!»

Асабісты комплексны план удзельніка Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» Самуйлік Наталлі Паўлаўны, студэнткі 5-га курса фізічнага факультэта ГДУ, члена камітэта ЛКСМБ ГДУ.

| Асноўныя напрамкі | Змест абавязацельстваў на год | Вынікі выканання |
|---|---|---|
| I. Вывучэнне марксісцка-ленінскай тэорыі. | Глыбока вывучыць матэрыялы XXVI з'езда КПСС, майскага і лістападаўскага (1982 г.) Пленумаў ЦК КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ. Падрыхтаваць даклад «Раскольніцкі курс мааістаў у камуністычным і рабочым руху», прачытаць яго ў групе. | |
| II. Барацьба за высокую якасць ведаў і прафесіянальнай падрыхтоўкі. | Аказаць дапамогу ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы групам 1-га курса. Прыняць удзел у конкурсе па спецыяльнасці ў алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Завяршыць вучэбна-даследчую работу па тэме: «Даследаванне дыфракцыі электрамагнітнай хвалі на рашотцы ў паралельных праваднікоў». | |
| III. Грамадска-палітычная практыка. Удзел ва Усесаюзным агітпаходзе студэнцкай моладзі, дапамога падшэфнай школе. | Як сакратару камсамольскага бюро курса прасачыць за ходам грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў на вытворчасці і ў школе. Аформіць дакументацыю народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. Аформіць факультэцкі стэнд па народнаму універсітэту маральна-эстэтычнага выхавання. Правесці заняткі ў астранамічным гуртку, прыняць удзел у афармленні стэндаў кафедры філасофіі. Аформіць пакой казак у дзіцячым доме. У ходзе Усесаюзнага агітпахода «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» прачытаць 2 лекцыі. | |
| IV. Грамадска-карысная праца. Удзел у рабоце СБА, сельскагаспадарчых атрадаў. | Прыняць удзел у 3-м працоўным семестры ў саставе СБА ГДУ. Прымаць удзел у суботніках і нядзельніках. Арганізаваць і правесці на курсе суботнік, а на атрыманыя грошы купіць падарункі ў падшэфную школу-інтэрнат № 3 г. Гомеля. | |
| V. Павышэнне культурнага ўзроўню, удзел у розных формах самадзейнай творчасці. | Знаёміцца з усімі новымі пастаноўкамі абласнога драмтэатра. Наведваць канцэрты класічнай музыкі, цыркавыя праграмы. Азнаёміцца з творчасцю паэта В. Шэфнера. Праслухаць цыкл лекцый на аддзяленнях выяўленчага мастацтва і музыказнаўства народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. | |
| VI. Заняткі фізкультурай і спортам, ваенна-патрыятычная работа. | Завяршыць здачу норм ГПА на сярэбраны значок. Прыняць удзел ва Усесаюзнай аперацыі «Летапіс Вялікай Айчыннай». Запісаць успаміны ветэранаў вайны, падрыхтаваць заметку ў шматтыражную газету «Гомельскі універсітэт». Актыўна ўдзельнічаць у Маршы міру савецкай моладзі, прыняць удзел у экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР». Аформіць калекцыю значкоў пра гарады Мінск, крэпасць-герой Брэст, Хатынь і Курган Славы. | |

*Нашы юбіляры*

# Ад настаўніка — да вучонага

**ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ДАЦЭНТА В. Р. СІМАНАВА**



Вячаслаў Рыгоравіч Сіманаў нарадзіўся ў в. Кастамарава Варонежскай вобласці ў сялянскай сям'і. Яго працоўная дзейнасць пачалася больш чым паўстагоддзя назад. Ён працуе настаўнікам, загадвае аднакамплектнай школай. З 1931 года, пасля ўвядзення сямігадовай адукацыі, малады настаўнік выкладае фізіку і матэматыку ў школе сяла Маркі Еўдакоўскага раёна на Варонежчыне, адначасова завочна вучыцца ў інстытуце павышэння падрыхтоўкі кадраў народнай адукацыі. З 1932 года В. Р. Сіманаў жыве ў працуе ў саўгасе «Кастрычнік», з'яўляецца настаўнікам мясцовай моладзі, актыўна ўдзельнічае ў калектывізацыі. Вячаслаў Рыгоравіч быў арганізатарам і першым старшынёй калгаса «Чырвоны партызан», аб'яднаўшага адзінаццаць сялянскіх двароў. У той жа час, у выніку атэістычнай работы, ён сфарміраваўся і як актыўны прапагандыст навуковых ведаў.

З 1935 па 1938 гады В. Р. Сіманаў — студэнт аддзялення геафізікі і тэарэтычнай фізікі Варонежскага універсітэта. Па яго заканчэнні Вячаслаў Рыгоравіч атрымаў назначэнне на пасаду дырэктара Раждзественскай сярэдняй школы Барысаглебскага раёна. Тут ён выкладаў фізіку і матэматыку.

Незадоўга да пачатку Вялікай Айчыннай вайны В. Р. Сіманаў быў прызваны на воінскую службу. Пасля вераломнага нападу гітлераўскіх акупантаў на нашу Радзіму разам з усім савецкім народам стаў на яе абарону. Цяжкай і драматычнай была франтавая дарога Вячаслава Рыгоравіча. Давялося яму вытрымаць катаванні ў канцлагеры. Аднак смеламу воіну ўдалося ўцячы з палону, адшукаць і ўліцца ў партызанскі атрад «Мсцівец», які дзейнічаў на тэрыторыі Літвы.

Кулямётчык, разведчык, падрыўнік — такімі былі партызанскія «прафесіі» Вячаслава Рыгоравіча. На яго рахунку — 8 пушчаных пад адхон эшалонаў са зброяй і боепрыпасамі, спалены цягнік з нямецкімі афіцэрамі-адпускнікамі, узарваныя на станцыях Батакале і Лібешкі вадакачка і маслазавод. У жніўні 1944 года, пасля злучэння партызанскага атрада з дзеючай арміяй, В. Р. Сіманаў зноў на фронце, удзельнічае ў вызваленні Кенігсберга (цяпер г. Калінінград). Вайна для яго закончылася пасля разгрому японскіх мілітарыстаў.

Складанасць салдацкага лёсу Вячаслава Рыгоравіча, франтавыя сустрэчы і ўражанні натхнялі яго на літаратурную працу. Аднак паездка ў г. Грозны да аднапалчан, атрыманы дыплом аб універсітэцкай адукацыі не дазволілі здрадзіць педагагічнай справе. В. Р. Сіманаў пераходзіць на вузаўскую працу. Ён — асістэнт кафедры вышэйшай матэматыкі Грозненскага нафтавага інстытута.

Тры дзесяцігоддзі таму назад Вячаслаў Рыгоравіч пераехаў у Гомель, і ўвесь гэты час яго навукова-педагагічная дзейнасць звязана з нашай ВНУ. У 1956 годзе ён паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэарэтычней фізіцы.

За час работы ў Гомельскім педінстытуце, а затым ва універсітэце В. Р. Сіманаў выдаў манаграфіі «Рэчыва і электрамагнітнае поле», «Колькасныя і якасныя пераўтварэнні ў мікрафізічных працэсах». На рахунку Вячаслава Рыгоравіча ўжо 57 навуковых публікацый. Ён кіруе даследаваннямі па тэме «Навукова-метадалагічныя асновы фізікі».

В. Р. Сіманаў працаваў дэканам фізіка-матэматычнага факультэта, загадчыкам кафедры, дацэнтам кафедры тэарэтычнай фізікі. На ўсіх пасадах ён зарэкамендаваў сябе кваліфікаваным навуковым і педагагічным работнікам, чулым таварышам. Ён плённа кіраваў студэнцкай навуковай працай ва ўніверсітэце і на факультэце, узначальваў школу «Юны фізік», быў старшынёй метадычнага савета факультэта, членам праўлення ўніверсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» і мясцовага камітэта.

Супрацоўнікам і студэнтам нашага факультэта В. Р. Сіманаў вядомы і як мастак-аматар. Ён неаднаразова ўдзельнічаў у разнастайных выстаўках. А яшчэ Вячаслаў Рыгоравіч страсны рыбалоў-спартсмен, пераможца і прызёр многіх вузаўскіх спаборніцтваў.

За баявыя і працоўныя заслугі В. Р. Сіманаў удастоены ордэна «Чырвонай Зоркі», некалькіх медалёў, Граматы Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Усё, што сказана намі, — толькі асобныя штрыхі з біяграфіі чалавека, які ўсім сваім жыццём вучыць нас пачуццю грамадзянскага абавязку, чэснасці, уважлівасці і дабраце. Гэта чалавек, які пастарэў гадамі, але па-ранейшаму малады душой, вялікі жыццелюб, наш Настаўнік і Сябра.

Ад імя калектыву ўсяго фізічнага факультэта, усіх былых і цяперашніх яго вучняў горача віншуем Вячаслава Рыгоравіча з юбілеем, жадаем яму моцнага здароўя, аптымізму, поспехаў у працы ў імя нашай Радзімы.

**Г. ГАДЛЕЎСКАЯ, асістэнт кафедры оптыкі, член прафкома універсітэта.**
**Т. ЖАЛОНКІНА, сакратар партбюро фізічнага факультэта.**

★ ★ ★

За шматгадовую навукова-педагагічную і выхаваўчую работу і ў сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР узнагародзіла Ганаровай граматай дацэнта кафедры тэарэтычнай фізікі **СІМАНАВА Вячаслава Рыгоравіча.**

Узнагарода была ўручана юбіляру ва ўрачыстай абстаноўцы на Савеце фізічнага факультэта.

*Студэнцкія канферэнцыі*

# СЯБРУЙЦЕ СА СПОРТАМ

У наш імклівы час чалавек стварыў для сябе шмат зручнасцей, што ў значнай ступені выслабаніла яго ад фізічнай працы, фізічнай актыўнасці. А гэта, у сваю чаргу, аказвае адмоўны ўплыў на здароўе чалавека, бо ўсім вядомы выраз: «Рух — гэта жыццё». Таму не выпадкова тэмай навукова-практычнай канферэнцыі пяцікурснікаў аддзялення фізічнага выхавання завочнага факультэта, якая адбылася нядаўна, быў уплыў фізічнай нагрузкі і лячэбнай фізкультуры на стан здароўя чалавека.

Канферэнцыю адкрыла дацэнт кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны Н. В. Карташова. Затым было заслухана восем невялікіх дакладаў студэнтаў-завочнікаў. Рыхтаваліся яны па выніках праведзеных імі назіранняў, даследаванняў непасрэдна на занятках школьнікаў, людзей сярэдняга і пажылога ўзросту рознымі фізічнымі практыкаваннямі, відамі спорту.

Даклад студэнта В. Грыневіча асвятляў уплыў фізічнай нагрузкі на стан сардэчна-сасудзістай сістэмы. Аўтар даклада правёў функцыянальнае даследаванне сардэчна-сасудзістай сістэмы пяцікласнікаў, якія займаюцца ў школьнай секцыі баскетбола. Атрыманыя вынікі яшчэ раз пацвердзілі: фізкультура і спорт станоўча ўплываюць на стан здароўя.

У дакладзе А. Папка гаварылася аб уплыве фізічнай нагрузкі на ўмацаванне сардэчна-сасудзістай сістэмы. Вынік яго даследаванняў — высокая працаздольнасць, хуткая адаптацыя да фізічнай нагрузкі ў тых, хто займаецца фізкультурай і спортам.

Г. Кушнярэвіч правяла даследаванні ў групе «Здароўе» пры гарадскім басейне «Дэльфін», у якой займаюцца людзі рознага ўзросту: ад 33 да 60 гадоў з рознымі захворваннямі. Як аказалася, заняткі бегам дазволілі ім паправіць здароўе, адчуць прыліў сіл і энергіі.

Аб тым, якую ролю адыгрываюць фізічныя практыкаванні ў рэжыме рабочага дня, расказала на канферэнцыі завочніца Г. Алейнікава. Яна працуе інструктарам-метадыстам вытворчай гімнастыкі ў Гомельскім гарплодгароднінагандлі.

З асаблівай цікавасцю слухалі ўдзельнікі канферэнцыі даклад А. Урсола «Масаж, як сродак аднаўлення працаздольнасці спартсмена».

Студэнт У. Белянкоў гаварыў на канферэнцыі аб урачэбна-педагагічным кантролі ў працэсе заняткаў боксам, а Э. Цвірко — аб уплыве фізічнай нагрузкі на людзей, якія займаюцца ў групе агульнафізічнай падрыхтоўкі.

«Чалавек павінен быць фізічна актыўным, займацца фізкультурай і спортам, таму што адчуванне гэтай фізічнай актыўнасці — адзіная асалода, дадзеная чалавеку прыродай», — сказаў на канферэнцыі ў сваім дакладзе студэнт А. Жукаў.

Каб захаваць сваё здароўе, заставацца на доўгія гады бадзёрымі і энергічнымі, сябруйце са спортам!

**В. ШЫНКАРЭНКА,**
**студэнт 5 курса аддзялення фізічнага выхавання завочнага факультэта, удзельнік канферэнцыі.**





**НА ЗДЫМКУ: з дакладам на студэнцкай навуковай канферэнцыі выступае А. Жукаў.**
**Фота аўтара.**

# НА СПАРТАКІЯДЗЕ «ЗДАРОЎЕ»

## Чэмпіёны БССР

У канцы студзеня з беларускага горада шахцёраў — Салігорска ва універсітэт прыйшла радасная вестка. Тут завяршыўся камандны чэмпіянат рэспублікі па шахматах па праграме VIII летняй Спартакіяды БССР. Бурна фінішавалі шахматысты ардэнаноснай Гомельшчыны. У выніку яны набралі 26,5 ачка і сталі чэмпіёнамі.

За каманду гамяльчан выступалі і два прадстаўнікі нашага універсітэта: адзін з мацнейшых маладых шахматыстаў рэспублікі студэнт ГДУ Аляксандр Міхалеўскі і старшы навуковы супрацоўнік Уладзімір Караткевіч.

Штогод у нашым універсітэце праходзіць спартакіяда «Здароўе» сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў. У яе праграму уваходзяць восем відаў спорту. Асаблівую цікавасць выклікае турнір шахматыстаў. Даўно ўжо не маюць сабе роўных матэматыкі. І сёлета, як паведаміў нам галоўны суддзя А. Косцікаў, каманда матэматычнага факультэта, як кажуць, была на галаву вышэй за ўсіх сваіх сапернікаў. На гэты раз яна набрала 18 ачкоў і ўпэўнена заваявала перамогу. На шэсць ачкоў адсталі шахматысты фізічнага і эканамічнага факультэтаў, якія занялі адпаведна другое і трэцяе месцы (фізікам прысуджана другое месца за лепшы паказчык у асабістай сустрэчы з эканамістамі). Наступныя радкі ў турнірнай табліцы занялі геолагі, біёлагі і гісторыка-філалагічны факультэт.

Мацнейшым шахматыстам сярод тых, хто выступаў на першай дошцы, стаў загадчык кафедры філасофіі прафесар У. М. Калмыкоў, які набраў 4,5 ачка з 5 магчымых. Уладзімір Мікалаевіч абараняў гонар біяфака.

Добрую гульню прадэманстраваў і адзін з мацнейшых шахматыстаў універсітэта Г. А. Фрыдман з матэматычнага факультэта.

* * *

У напружанай барацьбе праходзілі і спаборніцтвы стралкоў. Цікава, што ў камандным заліку прызёрамі сталі ў аналагічным парадку тыя ж факультэты, што і сярод шахматыстаў, — матэматычны, фізічны, эканамічны. Аднак, як канстатуе галоўны суддзя спаборніцтваў В. Харытошкін, вынікі стралкоў не суцяшальныя. Толькі пераможцу ў асабістым заліку ўдалося паказаць нарматыў трэцяга спартыўнага разрада.

* * *

Амаль да апошняй сустрэчы не было вядома, каманда якога факультэта выйдзе пераможцам у мужчынскім турніры па валейболу. Справа ў тым, што ні адной з іх не ўдалося пазбегнуць паражэння. У выніку напружанай барацьбы на першае месца выйшлі эканамісты. Другімі прызёрамі сталі геолагі, трэцімі — матэматыкі.

# ПАЯДЫНКІ НА БАРЦОЎСКІМ ДЫВАНЕ

У г. Караганда праведзена першынство ЦС «Буравеснік» па вольнай барацьбе. Зноў высокае спартыўнае майстэрства прадэманстраваў другакурснік факультэта фізічнага выхавання майстар спорту СССР Н. Айвазян. Ён стаў чэмпіёнам студэнцкага таварыства краіны ў найлягчэйшай (да 48 кг) вагавай катэгорыі.

* * *

Па праграме круглагадовай XXVI спартакіяды Белсавета «Буравеснік» паспяхова выступілі барцы нашага універсітэта. Спаборніцтвы праходзілі ў г. Гродна. Каманда ГДУ заняла трэцяе месца і прынесла свайму спортклубу 165 заліковых ачкоў. У вагавай катэгорыі 52 кг. на другую прыступку ганару ўзняўся В. Кураленка. Бронзавымі прызёрамі ў сваіх вагавых катэгорыях сталі В. Мельнікаў, А. Сувалаў і С. Баранаў.

* * *

У апошняй дэкадзе студзеня ў Мінску першынство студэнцкага таварыства рэспублікі аспрэчвалі па класічнай барацьбе юніёры. Юныя волаты нашага універсітэта вызначыліся і на гэтых спаборніцтвах. Камандай яны набралі 246 ачкоў і забяспечылі Гомельскаму аблсавету «Буравеснік» другое месца. Сярэбранымі прызёрамі турніра сталі В. Кураленка, С. Баранаў, Г. Казараў, бронзавым — В. Размераў.

**С. ДЗЕГЦЯРОЎ,**
**трэнер.**

* * *

Усесаюзны турнір у Гродна сабраў многіх мацнейшых барцоў класічнага стылю са зборных каманд Масквы (два калектывы), Літвы, Латвіі, Кіргізіі. Беларусь таксама была прадстаўлена двума камандамі, у тым ліку і барцамі Гомельшчыны. У турніры ўдзельнічалі 124 асілкі: 7 майстроў спорту СССР міжнароднага класа, 95 майстроў і 22 кандыдаты ў майстры спорту. Такая прадстаўнічасць была выклікана тым, што многім з барцоў прадстаіць удзел у VIII Спартакіядзе народаў СССР, і яны яшчэ раз правяралі сваю гатоўнасць.

У вагавай катэгорыі да 100 кг бронзавым прызёрам стаў студэнт факультэта фізвыхавання майстар спорту СССР міжнароднага класа В. Цакалаеў.

# У ЦЫРКУ—НОВАЯ ПРАГРАМА

На гэты раз на арэне Гомельскага дзяржаўнага цырка ў праграме «Маскоўскія зоркі» выступае некалькі цыркавых дынастый. Сярод іх эквілібрысты-рэкардсмены пад кіраўніцтвам заслужанага артыста РСФСР Аляксандра Мілаева. Мастацкі кіраўнік нумара — народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы Яўген Мілаеў. Са сваім нумарам «Цыркавы пляж» выступае і самы малады ўдзельнік праграмы — Жэня Мілаеў.

Унікальны, фантастычны паветраны палёт, які па праву лічыцца лепшым у савецкім цырку, выконваюць акрабаты пад кіраўніцтвам Аляксандра Херца — прадаўжальніка таксама яшчэ адной цыркавой дынастыі.

Рэкордныя трукі выконваюць удзельнікі акрабатычнага ансамбля «Рамантыкі» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Давейкі.

З нумарам «Антыпод» выступае прадстаўніца цыркавой дынастыі антыпадзістаў Анжэла Мікіцюк.

У рознажанравай праграме выступаюць таксама жанглёр на кані Сяргей Мітрохін, паветраная гімнастка Любоў Марцірасян, танцуе на дроце Ірына Кузняцова.

Увесь вечар на манежы клоуны Міхаіл Арлоў і Алег Кадыкоў.

Білеты — у прафкоме ГДУ.

# БРАТАЛЮБАЎ Аляксандр Іванавіч



3-га лютага на 76 годзе жыцця пасля хваробы памёр былы дацэнт кафедры хіміі Браталюбаў Аляксандр Іванавіч.

А. І. Браталюбаў нарадзіўся 15 верасня 1907 года ў Ленінградскай вобласці ў сям'і настаўніка. Пасля заканчэння Ленінградскага педагагічнага інстытута ён паступіў у аспірантуру і ў 1940 годзе паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю.

У гады Вялікай Айчыннай вайны А. І. Браталюбаў са зброяй у руках абараняў незалежнасць нашай Радзімы. За баявыя заслугі быў удастоены многіх урадавых узнагарод.

З 1948 года А. І. Браталюбаў працаваў у Гомельскім педінстытуце імя В. П. Чкалава, затым ва універсітэце. Працуючы дэканам факультэта, а пазней загадчыкам кафедры хіміі, А. І. Браталюбаў паказаў сябе выдатным арганізатарам—педагогам, якога любілі студэнты і высока цанілі выкладчыкі. За вялікі ўклад у справу развіцця і ўмацавання факультэта і кафедры ён неаднойчы заахвочваўся рэктаратам, Міністэрствам асветы БССР.

А. І. Браталюбава характарызавалі такія якасці, як высокае пачуццё грамадзянскага абавязку, высокая працаздольнасць, эрудыцыя, здольнасць перадаваць свае багатыя веды іншым.

Ён быў выдатным лектарам, якога з вялікай увагай слухалі не толькі студэнты, але і выкладчыкі.

А. І. Браталюбаў — ініцыятар правядзення хімічных алімпіяд школьнікаў, заснавальнік гуртка «Юны хімік». Быў ён і актыўным супрацоўнікам Інстытута ўдасканалення настаўнікаў. Да апошніх дзён свайго жыцця Аляксандр Іванавіч не парываў сувязей з калектывам кафедры хіміі, заснавальнікам якой ён быў.

Светлая памяць аб А. І. Браталюбаве, выдатным чалавеку, назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**

Рэктарат, партком, прафком і калектыў біялагічнага факультэта універсітэта глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога загадчыка кафедры хіміі дацэнта БРАТАЛЮБАВА Аляксандра Іванавіча і выказваюць спачуванне сям'і і родным памёршага.

Рэктарат, прафком, дэканат фізічнага факультэта, кафедра нямецкай і французскай моў выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыцы гэтай кафедры ЦАРАНОК Наталлі Фёдараўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 50080
Заказ 752.